■ Спорт-тайм

# БАТЭ ІДЗЕ Ў АДРЫЎ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі чарговага тура чэмпіянату краіны па футболе, узнагароды, што заваявалі беларускія весляры на чэмпіянаце Еўропы, і пра сапернікаў нашых спартсменаў на чэмпіянатах свету па гандболе.**

***1. Дзесяць узнагарод заваявалі беларусы на чэмпіянаце Еўропы па веславанні на байдарках і каноэ, які завяршыўся ў Маскве.*** Залатыя медалі на рахунку Надзеі Макарчанкі і Алены Ноздрывай (500 м у каноэ-двойцы), а таксама Глеба Саладухі і Аляксандра Валчэцкага (200 м у каноэ-двойцы). Званне чэмпіёнкі Еўропы ў байдарцы-адзіночцы на дыстанцыі 5000 м пацвердзіла Марына Літвінчук, якая абараніла тытул найлепшай у гэтым відзе — 22 хв. 23,450 сек.

Сярэбраныя ўзнагароды заваявала жаночая байдарка-чацвёрка на дыстанцыі 500 м у складзе Маргарыты Махневай, Вольгі Худзенкі, Надзеі Ляпешкі і Марыны Літвінчук. Таксама на другую прыступку п'едэстала ў Маскве падняліся канаісты Андрэй і Аляксандр Багдановічы на дыстанцыі 1000 м.

У актыве беларускіх весляроў таксама пяць бронзавых медалёў. У мужчынскай байдарцы-двойцы на 500 м Віталь Бялько і Раман Петрушэнка, у жаночай байдарцы-двойцы на 500 м Надзея Ляпешка і Марына Літвінчук занялі трэцяе месца. Марына Літвінчук у пары з Маргарытай Махневай сталі бронзавымі прызёркамі на дыстанцыі 200 м. У спаборніцтвах канаістаў у вырашальных заездах лодак-адзіночак на 200 м Арцём Козыр прынёс яшчэ адну бронзу зборнай Беларусі. У заключным відзе праграмы турніру Алег Юрэня паказаў трэці вынік у самай працяглай гонцы на 5000 м.

У агульнакамандным заліку зборная Беларусі заняла чацвёртае месца. Першынствавалі весляры з Венгрыі, на рахунку якіх 14 узнагарод, у тым ліку пяць залатых.

**2. Завяршыліся ўсе матчы 14-га тура чэмпіянату краіны па футболе.** Барысаўскі БАТЭ ўзяў дзясятую перамогу ў сёлетнім першынстве і адарваўся ад найбліжэйшых пераследнікаў на 7 ачкоў. На сваім полі барысаўчане перайгралі «Віцебск» — 1:0. Мінскае «Дынама» прайграла ў Маладзечне футбалістам «Іслачы» (1:3) і страціла месца ў тройцы лідараў. Сталічныя «Крумкачы» абыгралі ў Брэсце мясцовае «Дынама» — 2:1, салігорскі «Шахцёр» згуляў унічыю ў гасцях з мазырскай «Славіяй» — 1:1. Не змаглі выявіць пераможцу футбольныя клубы «Мінск» і «Граніт» — 0:0, а таксама «Нёман» і «Слуцк» — 0:0. «Белшына» была мацнейшай за «Нафтан» — 1:0, а «Тарпеда-БелАЗ» прайграў «Гарадзеі» — 1:3.

***3. На мінулым тыдні з'явілася несуцяшальная навіна для беларускіх заўзятараў.*** З-за траўмы калена Вікторыя Азаранка не выступіць на прэстыжным Уімблдонскім турніры, а ўжо на старце гэтага тыдня ў замежных СМІ з'явілася інфармацыя, што гэтая траўма можа перашкодзіць Вікторыі выступіць на Алімпійскіх гульнях у Бразіліі.

***4. У Парыжы прайшло лёсаванне папярэдняга этапу фінальнай стадыі мужчынскага чэмпіянату свету па гандболе.*** Зборная Беларусі трапіла ў папярэднюю групу С, дзе яе сапернікамі будуць гандбалісты Саудаўскай Аравіі, Германіі, Харватыі, Венгрыі і Чылі. Нагадаем, пасля матчаў групавога раўнда ў 1/8 фіналу выйдуць па 4 лепшыя каманды. 25-ы па ліку мужчынскі планетарны гандбольны форум пройдзе ў студзені 2017 года ў Францыі.

Тым часам у Вене адбылося лёсаванне адборачных груп жаночага чэмпіянату свету па гандболе. Наша зборная трапіла ў 2-ю кваліфікацыйную групу, дзе будуць сапернічаць таксама каманды Швейцарыі, Турцыі і Косава. Дакладныя даты адборачных сустрэч будуць вызначаны пазней. Каб выйсці ў плэй-оф еўрапейскага адбору на сусветнае першынство, беларускам трэба заняць адно з двух першых месцаў.

# ФІНІШ УСЁ БЛІЖЭЙ




**Сталі вядомыя зборныя, якія трапілі ў чвэрцьфінал Еўра-2016. Першай шчаслівай стала каманда Польшчы, якая выбіла з далейшай барацьбы зборную Швейцарыі. Асноўны час матча скончыўся з лікам 1:1, дадатковы час таксама не вызначыў пераможцу. Усё вырашылася ў серыі пенальці, дзе нашы суседзі змаглі аформіць сабе пуцёўку ў 1/4 турніру — 5:4.**

У другім паядынку зборная Уэльса адолела Паўночную Ірландыю з мінімальным лікам 1:0. Адзіны гол быў забіты на 75-й хвіліне, Гарэт Макаўлі адправіў мяч ва ўласныя вароты.

Зборныя Партугаліі і Харватыі вызначылі зыход паядынку толькі за 3 хвіліны да фінішу авертайму. Куарэжма з лініі варатарскай пляцоўкі прынёс вікторыю партугальцам — 1:0.

Гаспадары турніру, футбалісты зборнай Францыі, у Ліёне перайгралі Ірландыю 2:1. Абодва мячы пераможцаў на рахунку Антуана Грызмана: ён спачатку аднавіў раўнавагу ў ліку, а яшчэ праз тры хвіліны паставіў пераможную кропку і вывеў сваю каманду ў чвэрцьфінал.

Зборная Германіі без праблем выйграла ў Славакіі — 3:0, а Бельгія з буйным лікам перамагла футбалістаў з Венгрыі — 4:0. Учора ўвечары адбыліся заключныя матчы 1/8 кантынентальнага чэмпіянату, зборная Італіі згуляла супраць іспанцаў, а футбалісты Англіі сустрэліся з калегамі з Ісландыі.

**Герой дня**

Гулец зборнай Польшчы Якуб Блашчыкоўскі забіў адзіны для сваёй каманды гол у матчы 1/8 фіналу ў асноўны час, што дазволіла змагацца за выхад далей. Пасля гэтага футбаліст рэалізаваў пасляматчавы пенальці і зрабіў вялікі ўклад у перамогу сваёй зборнай. Нагадаем, на групавым этапе з яго галявой перадачы быў забіты адзіны гол у вароты Паўночнай Ірландыі, а таксама менавіта гол Якуба прынёс Польшчы перамогу над Украінай.



Партугалец Пепе суцяшае свайго аднаклубніка па мадрыдскім «Рэале» харвата Луку Модрыча.

**Фатальная памылка**

Граніт Джака прабіў міма варот у пасляматчавай серыі пенальці і пазбавіў Швейцарыю шанцаў на выхад у чвэрцьфінал. Астатнія 9 удзельнікаў серыі свае спробы рэалізавалі.

**Антывыніковасць**

Матч Харватыі і Партугаліі ў 1/8 чэмпіянату журналісты і заўзятары ўжо паспелі ахрысціць самым сумным і бяздарным у выкананні футбалістаў абедзвюх камандаў. Спартсмены гулялі 120 хвілін і за гэты час нанеслі адзін удар па варотах, які і прынёс перамогу Партугаліі.

Дарэчы, гэтая каманда асабліва крытыкуецца за сваю антывыніковасць на працягу ўсяго чэмпіянату. Нагадаем, Партугалія выйшла ў плэй-оф з трыма нічыімі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.45 | 17.05 |
| Віцебск — | 4.21 | 21.43 | 17.22 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.36 | 17.06 |
| Гомель — | 4.36 | 21.23 | 16.47 |
| Гродна — | 4.57 | 21.59 | 17.02 |
| Брэст — | 5.07 | 21.50 | 16.43 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 27.06–03.07.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Іоны, Рыгора, Фёдара.*
***К.*** *Вольгі, Раісы, Лявона, Паўла.*

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

ВАРШАВА +26..+28°C
ВІЛЬНЮС +24..+26°C
КІЕЎ +26..+28°C
МАСКВА +22..+24°C
РЫГА +22..+24°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°C



Фота Вольгі ЛУКШЫЦ.

## УСМІХНЕМСЯ

**У краме элітных пасцельных рэчаў:**

**— Для добрага сну вам неабходна вельмі добрая і дарагая падушка. Я вам прапаную вось гэту, за 1000 еўра.**

**— А можа, я лепш проста навалачку грашыма наб'ю?**

Мама гадавала Люсю ў строгасці, гаспадарлівай – каб і боршч магла зварыць, і ў кватэры прыбрацца, і памыць, і папрасаваць.

...Але Люсі ўсё гэта не спатрэбілася, яна вырасла прыгожай!

Дзяцінства — лыжачку за маму, лыжачку за тату, лыжачку за брата...

Пасталеў — усё па-ранейшаму, але лыжачку замяніла чарачка.

**— Вочы, якія гарэлі халодным агнём, моцныя і далікатныя рукі, гарачае дыханне...**

**— Бэла Іосіфаўна, а яшчэ якія-небудзь прыкметы былі ў рабаўніка?**

Калі ў Адэсе на сцяне вісіць рэпрадукцыя карціны Айвазоўскага, то пакой лічыцца з відам на мора!




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

Даты | Падзеі | Людзі

**28 ЧЭРВЕНЯ**

**1569** год — у Любліне было падпісана пагадненне аб аб'яднанні Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага ў адну дзяржаву — Рэч Паспалітую. Люблінская ўнія завяршыла працэс аб'яднання дзвюх дзяржаў, які пачаўся з падпісання Крэўскай уніі 1385 года, па якой вялікі князь літоўскі Ягайла, уступіўшы ў шлюб з



польскай каралевай Ядвігай, абвяшчаўся польскім каралём. У 1401 годзе Віленска-Радамская ўнія ўдакладніла ўмовы Крэўскай уніі. Разгляд пытання аб Люблінскай уніі пачаўся ў студзені 1569 года на агульным сойме польскіх і літоўскіх феадалаў. З-за барацьбы польскай шляхты за дамінаванне, а літоўскіх вяльможаў — за захаванне незалежнасці сойм працягваўся з перапынкамі да жніўня 1569 года. Нарэшце польскаму каралю Жыгімонту ІІ Аўгусту ўдалося зламаць супраціўленне эліты Вялікага Княства Літоўскага. Люблінская ўнія прадугледжвала ўтварэнне ў Польшчы і Літве адзінай дзяржавы, агульнай грашовай сістэмы, а таксама агульнага сойма. На чале Рэчы Паспалітай стаяў кароль, якога выбіралі сумесна польскія і літоўскія феадалы. Рэч Паспалітая выступала як адзіная дзяржава таксама і на міжнароднай арэне. Разам з тым унія не ліквідавала цалкам дзяржаўнасці Літвы. ВКЛ захавала свае заканадаўства і суды, асобныя вышэйшыя адміністрацыйныя пасады, казну, войска, афіцыйнай мовай засталася тагачасная беларуская.

**1906** год — 110 гадоў таму нарадзіўся Васіль Емяльянавіч Самуцін, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Беластоцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце. З 1942 года рэдактар падпольнай газеты «Віцебскі рабочы», з 1943-га — першы сакратар Беластоцкага падпольнага абкама КП(б)Б, кіраўнік Беластоцкага партызанскага злучэння. Пасля вайны быў на партыйнай і журналісцкай рабоце. У 1950-53 гадах — намеснік міністра лясной гаспадаркі БССР. Памёр у 1981 годзе.

**1941** год — 75 гадоў таму пачалася трохгадовая акупацыя сталіцы Беларусі горада Мінска (вызвалены савецкімі войскамі 3 ліпеня 1944 г.); захоплены таксама гарады Бабруйск, Стоўбцы, Нясвіж, Дзяржынск, Ваўкавыск.

**Было сказана**

**Аляксей ПЫСІН, паэт:**

*«Хлеб, напэўна, нікому не горкі — толькі горкая праўда зямлі».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2465.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 чэрвеня 2016 года.